крытычная мапа

# ГОМЕЛЬ



АЛЬТЭРНАТЫЎНАЯ МАПА ГОРАДА АД

«ТАЛАКІ»

ЗРОБІМ ЛЕПШ!


Азія
Забег
Zoo
74
Хатаевіча
Каўказ
Падгорная
Палеская
Савецкая
1910
Праспект Перамогі
Гарэлае балота
Кірава
Валатаўская
Свісток
Праспект Леніна
Замкавая вул
71
MADE
Гомельская
Амерыка
Заління
Гагарына
Кагальны роў
Улица
Вуліца
49
Інтэрнацыянальная
Paleo
75
Барыкіна
Пралетарская
Спасава Слабада
Якубоўка
Фрунзэ
Манастырок
Крытычная мапа
Гомель
Любны

# Ад аўтараў

Часта можна пачуць што ў Гомелі няма на што глядзець, што гэта шэры горад, у якім нічога цікавага не адбываецца. Пераканаными ў адваротным, мы вырашылі паглядзець на наш родны горад інакш і данесці гэта да ўсіх неабыякавых.

Гомель - старажытны горад, які шмат чым адметны. Ён нічым не горшы за любы іншы горад, і пра гэта мусяць ведаць усе!

На дадзенай мапе мы паспрабавалі адлюстраваць плюсы і мінусы горада над Сожам, адзначыць ягоныя моцныя бакі і праблемы, якія трэба вырашаць, каб ён быў яшчэ лепей. Мы не абмінулі ўвагай і будучыню горада і прапанавалі свае паляпшэнні.

Дадзеная мапа была зроблена ў межах кампаніі «Зробім лепш!».

Пры яе складанні быў ужыты прынцып "крытычнага мапавання", пры якім удзельнікі самі вызначаюць, што адлюстраваць на мапе і якой яна мае быць. Гэта дазваляе паглядзець на звыклыя рэчы інакш і акцэнтаваць увагу на пэўных аб'ектах, рэчах і з'явах.

**Гарадскія адметнасці**

**Гарадская актыўнасць**

**Фізічная актыўнасць**

**Гісторыя і гарадскія легенды**

**Крытычнае**

**Прапановы і мары**

Свісток — **Назвы гістарычных раёнаў**

ВАЛАТАЎСКАЯ — **Назвы вуліц**

**Прамысловыя зоны**

Кастрычнік 2013 г.

1. Гэта - вакзал, і калі ты ўпершыню ў Гомелі, то, хутчэй за ўсё, ты тут!
2. І ты думаеш, што ў нашым горадзе, акрамя палаца, няма на што глядзець? Але ж гэта не так. Горад - гэта не толькі архітэктурныя помнікі (якіх у нас таксама хапае) ці вялізныя ансамблі. Сапраўдную душу горада складаюць таксама і маленькія цікавосткі, прышпілы і легенды. І мы прапануем табе паглядзець на горад менавіта з гэтага боку. Так пачнем жа!
3. Пахі могуць быць і прыемнымі. Прынамсі, прамежак Савецкай ад вуліцы Хатаевіча да Універсітэцкай ўжо здаўна можна пераймяноўваць у "шакаладную алею". Мясцовая цукеркавая фабрыка "Спартак" надае гэтаму месцу той самы чароўны водар.
4. Голуб — птушка міру? Тады адно з самых мірных месцаў знаходзіцца за ўніверсітэтам імя Ф. Скарыны — там месціцца галубятня.
5. Адзіны драўляны помнік "превед-медведу" знаходзіцца менавіта ў нашым горадзе.
6. Аповеды пра зомбаскрыні не хлусня, і ў Гомелі нават помнік гіпнажабе ёсць (памятай правіла спаткання Адысея з гаргонай Медузай: толькі не глядзі ёй у вочы!).
7. Па пешаходным мосце праз Сож можна хадзіць як наўпрост, так і з доляй адрэналіну ў крыві. Прынамсі аматары экстрыму здаўна карыстаюцца магчымасцю зрабіць пераход над мостам (парада ад мясцовых: прыхапі з сабой паходню/фаер. Адзнач сябе - флікеры тут не дапамогуць).
8. У цэнтральным парку Гомеля надзвычай багата нахабных вавёрак. Не чакай ад іх удзячнасці - яны разбэшчаны ўжо задоўга да цябе халяўнай падкормкай шматлікіх турыстаў.
9. Цэнтральная сталоўка ўсіх галубоў Гомеля, або Piazza San Pietro e Paolo, знаходзіцца менавіта тут, перад гомельскім саборам пятра і Паўла. Прыхапі жменьку семечак, што забракавалі вавёркі, і ты будзеш аб'ектам увагі і ўсеагульнай птушынай любові на некалькі хвілін.
10. Вулічны мастак Валеры Ляшкевіч славуты не толькі ў Гомелі, але нават і ў мастацкіх колах Санкт-Пецярбурга. Набудзь у яго карціну і хто ведае, мо праз гады яна будзе каштаваць даражэй за творы Пікаса.
11. Відэа пра бабулю-блюзмэнку з Гомеля, што грае лямпачкай на гітары, праглядзелі ўжо больш за 4 мільёны разоў на Youtube. Ня будзь скотам і падтрымай незалежнага творцу!
12. Гомель - сталіца цяжкага рока і метала Беларусі. На ролю сталічнасці прэтэндуюць яшчэ і прадстаўнікі гомельскай хіп-хоп сцэны, але як бы там ні было, большая частка сапраўднай музычнай актыўнасці ў нашым горадзе адбываецца ў ГЦК на Ірынінскай, дзе месціцца і гомельскі Рок-цэнтр.
13. Каля парэшткаў былога чыгуначнага маста праз Сож захаваліся і абарончыя збудаванні - Доўгатэрміновыя агнявыя кропкі па абодвух баках ракі. На жаль, падыйсці бліжэй і абследаваць іх не выпадае магчымым – масты ахоўваюць і дагэтуль.
14. Толькі мы маем сапраўдны тэлепорт у цэнтры горада. Сапраўдны партал у іншы свет. І гэта трэба ўспрымаць літаральна, бо ў свой час там быў звычайны электрашчыт.
15. Прамежак між вуліцай Кірава і вакзалам ужо здаўна можна пераймяноўваць у Незалежную Цыганскую Рэспубліку…
16. Няшмат хто ведае, што на вул. Пралетарскай, 18А знаходзіцца Спаса-Праабражэнская стараверская царква, збудаваная яшчэ ў 1905 годзе. Бальшавікі ўзвялі перад ёй будынак, каб прыхаваць месца рэлігійнага культу ад штодзённых позіркаў пралетарыяў. Схавалі так, што гамельчукі і дагэтуль пра ейнае існаванне амаль не ведаюць.
17. Сапраўдная брукаванка кан. XIX – пач. XX ст. захавалася ў Гомелі ў дзвух месцах — па вул. Талстога ў Манастырку і па вул. Ляшчынскай, што ў Залініі.
18. Наш горад славіцца магчымасцю адпачыць летам на пляжах, якія месцяцца літаральна ў пяці хвілінах ад цэнтра.
19. Любіш фатаграфаваць і дзяліцца сваімі здымкамі? Тады прыходзь на фотасушку ў Піянерскі скверык!
20. Незадаволены экалагічным становішчам у нашым горадзе? Хочаш зрабіць яго больш

зялёным? Тады далучайся да сяброў з Асацыяцыі дзяцей і моладзі «АСДЕМО»! Іх офіс знаходзіцца па вул. Ланге, 17.

21 Наш горад здаўна славіцца сваімі разумнымі жыхарамі. Менавіта з сожскіх берагоў выйшлі такія майстры “Што? Дзе? Калі?”, як Леанід Клімовіч, Сяргей Капуснікаў, Аляксей Палявой і іншыя. Далучайся і ты!

22 Шахматысты і шашысты Гомеля збіраюцца ў адмысловым збудаванні напрыканцы парку, каб адтачыць свае навыкі.

23 Аматары хэндмэйду і стылёвых рэчаў рэгулярна ладзяць адмысловы “Flea market” дзеля распродажу сваіх вырабаў і сустрэч з сябрамі. Месца правядзення рынку часта змяняецца, але апошнім разам было ля крэатыўнага і музычнага андэграўнд-бара “Кватэрнік”, што на Білецкім спуску.

24 Аматары класікі, арт-хаўсу і інтэлектуальнага кіно сустракаюцца на кінапрагляды ад аб’яднання “Studio28” у Абласной бібліятэцы імя Леніна.

25 Цікаўныя да адвечных філасофскіх і духоўных пытанняў маюць магчымасць наведаць адмысловыя кінапрагляды пры гомельскім касцёле Раства Божай Маці.

26 Валанцёры па абароне бадзяжных жывёлаў у Гомелі рэгулярна ладзяць акцыі па бясплатнай раздачы безпрытульных катоў і сабакаў у добрыя рукі. Адным з месцаў для гэтых мерапрыемстваў з’яўляецца ГЦК на Ірынінскай, 16.

27 Калекцыянеры-філатэлісты, фалерысты, мілітарысты і ўсе іншыя разнавіднасці калекцыянераў збіраюцца кожную нядзелю ў ГЦК.

28 Стыхійныя выступы вулічных музыкаў часцей за ўсё адбываюцца ў падземным пераходзе ля “Новага ўнівермагу”. Але хацелася б, каб такое месца было не адзіным і афіцыйна дазволеным.

29 Гомельская альтэрнатыўная моладзь ладзіць свае дэнс-батлы на Ірынінскай. Адчуваеш рытм? Тады табе да іх!

30 Мілым месцам танцавальных сустрэч для людзей старэйшага ўзросту па выходных з’яўляецца пляцоўка за палацам творчасці дзяцей і моладзі “Юнацтва”.

31 Аматары беларускіх народных танцаў маюць магчымасць развучыць іх пад гукі дуды з гомельскай “Талакой”. Пляцоўкай для рэпетыцый у цёплы час году выступае прастора ля Білецкага спуска.

32 Гомельскія раварысты збіраюцца на свае сустрэчы на алеі праспекта Перамогі.

33 Хочаш паганяць на ровары, а яго няма? Арэндуў у пункце проката і ганяй!

34 Трэба адрамантаваць свой сяброваp? Адна з кропак рамонту знаходзіцца па вул. Інтэрнацыянальная, 9.

35 Звычайны роварны шпацыр недастаткова экстрымальны для цябе? Сядай на ВМХ і руш да фантану на плошчы Леніна!

36 Самае папулярнае месца скейтараў у Гомелі завецца "На "галаве".

37 Сожскія воды ўзрасцілі ўжо не адно пакаленне славутых спартсменаў-весляроў. Некаторыя з іх нават станавіліся алімпійскімі чэмпіёнамі. Ёсць у Гомелі і асобны вяслярны канал для трэніровак. Дзе яшчэ гэтыя аб'екты знаходзяцца ў цэнтры горада?

38 Аматары слэклайну (хаджэння на нацягнутай стужцы) у цёплы сезон ладзяць свае "пахаджэнні" на гомельскім пляжы.

39 Адным з аб’ектаў для скокаў з вяроўкай з’яўляецца пешаходны мост праз Сож. Нярэдка раніцаю можна пачуць жыццярадасныя водгукі і ўражанні пад час палёту ад гомельскіх экстрымалаў!

40 Спусціцца з аднаго з узгоркаў у цэнтры горада на санках — гэта мусіць зрабіць кожны гамялянін!

41 Аматары выгукаў "лыжню!" маюць для сваіх практыкаванняў вялікія абшары гомельскага парка.

42 Менавіта ў нашым горадзе быў згуляны першы ў Беларусі афіцыйны футбольны матч. Адбылося гэта ажна ў далёкім 1910 годзе.

43 У Вялікую Айчынную вайну ў гарадскіх турмах, 5 лагерах смерці і 4 гета акупанты

акупанты знішчылі звыш 100 тыс. чалавек. Лагер для савецкіх ваеннапалонных "Дулаг-121" месціўся як раз на тэрыторыі сённяшняй фабрыкі “8 сакавіка”.

44 Так склалася, што большая частка гістарычнай забудовы Гомеля была знішчаная падчас Другой сусветнай вайны. Але частку архітэктурнага ансамблю к. XIX - пач. XX ст. пасля вайны вырашылі ўрэшце рэшт аднавіць. У выніку мы маем дастаткова эклектычную, але пры гэтым гарманічную і атмасферную забудову ад плошчы Леніна да новага універмага.

45 Адной з гарадскіх легендаў Гомеля з’яўляецца існаванне падземнага хода, што вядзе ў невядомым накірунку. Прычым кожны гамяльчук імкнецца падоўжыць гэты ход. Некаторыя сцвярджаюць, што ён можа вывесці з парка ажна на другі бераг Сажа!

46 Гомель — сапраўдны анклаў Цмачынага Каралеўства! Маленькія і вялікія, цмакі і цмачыхі хаваюцца на будынках, ліштвах, пляжах і клумбах. Больш за тое, у нас іх вывучаюць нават, і ёсць сапраўдныя гомельскія цмоказнаўцы. А нашчадак самага старажытнага, яшчэ радзіміцкага, цмока прыхаваўся ў самым цэнтры... Слабо адшукаць?

47 Бадай што самым знакамітым літаратурным персанажам з Гомеля з’яўляецца Лазік Ройтшванец – габрэй-кравец з Кагальнага рова, жыццё і прыгоды якога апісаў у сваім творы пісьменнік Ілля Эрэнбург.

48 Станіслаў Шабунеўскі – архітэктар, які шмат у чым сфармаваў сучасны выгляд цэнтру Гомеля. Выбітныя будынкі ў розных стылях, ад неакласіцызма да канструктывізма — спадчына, якую пакінуў нам гэты сапраўды ганаровы Гамялянін. На вялікі жаль, адзінае, што нагадвае зараз аб ягоным існаванні — роспіс на фасадзе дома 34 па вул. Кірава, што пабудаваны па ягоным праекце.

49 Наш горад перанасычаны рэліктамі савецкай эпохі. Адлюстравана гэта і ў назвах вуліц: вул. Камуністычная, Камсамольская, Калгасная, Пралетарская, Дзяржынскага і цэлых 8 “завулкаў Ільіча”! Час ідзе, і горад мусіць рушыцца разам з ім.

50 Існаванне побач з гістарычным цэнтрам горада электрастанцыі, што забруджвае навакольнае асяроддзе, мы лічым анахранізмам у XXI стагоддзі.

51 Жаночая папраўчая калонія № 4 – яшчэ адзін аб’ект у самым цэнтры горада, якому тут не месца.

52 Дзіўна, але факт: у парку імя Луначарскага дагэтуль забаронена перасоўвацца на роварах!

53 Прыкра гэта прызнаваць, але гомельскі парк, што месціцца на другім беразе Сажа, вельмі брудны.

54 Каля СШ № 24 заўжды пахне каналізацыяй. Калектар або размеркавальны пункт, што там знаходзіцца, “радуе” гараджанаў ужо не першае дзесяцігоддзе сваім водарам, але вырашыць гэтую праблему дагэтуль мала хто адважваўся.

55 Гомель – горад каштанаў! Прынамсі так калісьці было. Наш горад заўжды быў зялёным, але некалькі апошніх год хворыя дрэвы адразу зрубаюць, а замест іх часцей за ўсё наогул нічога не высаджваюць.

56 Колькасць спажывання алкаголю на аднаго чалавека ў Беларусі з кожным годам расце. У нашым жа горадзе віна-гарэлачны завод знаходзіцца літаральна ў цэнтры. Аматары “чарнілаў” любяць гэтае месца і асаблівы імпэт маюць яшчэ і да чарнільніц. А то! За пяць чарнільніц можна набыць новыя чарнілы!

57 Менавіта ў нашым горадзе сфармавалася ўнікальная гістарычная драўляная забудова. Ейнай адметнасцю з’яўляецца надзвычай багаты разьбяны дэкор, што ўвабраў у сябе самыя розныя традыцыі. Шмат якім з гэтых будынкаў больш за сто год, і яны перажылі столькі самых розных падзей XX ст., каб быць знішчанымі сёння. Гарадскія ўлады не бачаць у іх аніякай каштоўнасці, і паводле генплана хочуць знішчыць усю малапавярховую драўляную забудову ў цэнтры горада.

58 Возера Дзядно, якое схаванае дрэвамі ад вачэй гамельчукоў, на вялікі жаль, вельмі забруджанае месца. Да таго ж яно мае тэндэнцыю да высыхання ў летніперыяд. Шкада, што такі цікавы аб’ект можа знікнуць з мапы нашага горада. Пры належным падыходзе гэта магла б быць прыгожая зона адпачынку. Дзеля гэтага варта толькі пачаць штосьці змяняць. Змяняць ужо зараз.

59 Будаўніцтва новага аўтамабільнага маста праз раку Сож ужо не першы год выклікае спрэчкі. Акрамя пагаршэння экалогіі і памяншэння рэкрэацыйнай зоны ў парку і на пляжах, пракладка шашы таксама пагражае шматлікім археалагічным аб’ектам, перш за ўсё — самым старажытным на тэрыторыі Гомеля курганам.

60 Некалькі год таму, калі яшчэ не была скончаная рэстаўрацыя Палаца чыгуначнікаў, з'явіліся чуткі, што ў гэтым будынку збіраюцца адчыніць оперу. Пакуль што рэалізаваная гэтая ідэя не была, але Прывід гомельскай оперы яўна незадаволены гэтым!

61 Ужо другое дзесяцігоддзе ва ўсіх апытаннях на тэму "Чаго не хапае Гомелю?" на першым месцы апыноўваецца McDonalds.

62 У Гомелі існуе афіцыйная пешаходная дарога, але ейная працягласць занадта маленькая. Да таго ж, там мала што адбываецца. Але на суд грамадскасці ўжо выносілася ідэя перакрыцця, прынамсі, на выходныя, вуліц Ірынінская і Пушкіна з арганізацыяй на іх разнастайных забаўляльных мерапрыемстваў па аналогіі з вуліцай Карла-Маркса ў Мінску.

63 Вежа фабрыкі "8 Сакавіка" ўжо не першае дзесяцігоддзе прыцягвае ўвагу гамельчукоў. Турысты ж часта лічаць, што гэта – гарадская ратуша. Як бы там ні было, аб'ядноўвае ўсіх адно – прага паглядзець на наш прыгожы горад з аглядальнай пляцоўкі.

64 На пачатку "нулявых" у Гомелі адбыўся буйны міжнародны фестываль графіці і стрыт-арту "Meeting of styles". Мастакі з самых розных куткоў зямлі ўпрыгожвалі сваёй творчасцю бятонную набярэжную, а гараджане маглі атрымаць асалоду ад цікавых выяў. На жаль, традыцыя правядзення фестывалю перарвалася. Але чаму б яе не адрадзіць?

65 Гэтым летам дастаткова актыўна абмяркоўвалася думка пра стварэнне ролернай сцяжынкі ў парку за мостам. Зімой — лыжнікам, а летам — ролерам!

66 Таксама б не пашкодзіў гораду і роварны маршрут, які б пралягаў праз гістарычныя раёны Гомеля. Цікава і здарова!

67 Нерэгуляваны пераход вуліцы Пралетарскай між Палацам спорту і забаўляльным цэнтрам "Еўропа" замаруджвае аўтамабільны рух, а пешаходам часта даводзіцца падоўгу чакаць, пакуль іх прапусцяць кіроўцы, або на свой страх і рызыку перабягаць дарогу. Усталяванне ж светлафору з кнопкай выкліку зялёнага сігналу адразу б вырашыла праблему.

68 Калісьці ў гомельскім парку атракцыёнаў было нават "Чортава кола". Але падчас рэканструкцыі яго разабралі і дагэтуль абяцаюць аднавіць. Абяцанням ужо некалькі год, а кола і сёння не там.

69 Абаронцы драўлянай гістарычнай забудовы Гомеля ўжо не першы год выступаюць за стварэнне адмысловых раёнаў у цэнтры горада, куды можна было б перанесці найбольш каштоўныя ўзоры нашай спадчыны. Але гэтыя будынкі ні ў якім разе не павінны быць сумнымі помнікамі самім сабе! Няхай у адрэстаўраваных хатках адкрыюцца кавярні, сувенірныя крамы, арт-галерэі, бары, офісы і т.п.

70 Адным з галоўных жаданняў гамельчукоў з'яўляецца пабудова метро. І хоць метрапалітэна ў нашым горадзе яшчэ няма, але пра яго нават існуе ўжо песня: "Гомельскае метро, гомельскае метро, хто мне раскажа, хто падкажа, дзе ж яно, дзе ж яно".

71 У нашым горадзе забытая вялікая колькасць гістарычных назваў вуліц — Замкавая (праспект Леніна), Магілёўская (вул. Кірава),Траецкая (Сялянская), Мясніцкая, Свечная, Мільённая і шмат якія іншыя. Мы выступаем за вяртанне вуліцам іх гістарычных назваў.

72 У сувязі з актыўным пашырэннем вул. Барыкіна ў хуткім часе пачнецца забудова Залініі шматпавярховікамі. Пры гэтым на зялёныя зоны адпачынку гарадскія ўлады пры планаванні будучых раёнаў часцей за ўсё забываюцца.
Каб мець годныя месцы адпачынку і палепшыць экалагічную сітуацыю ў горадзе яшчэ ў 70-х гг. існавала ідэя стварэння "зялёнага кола" вакол гістарычнага цэнтра горада якое б складалася з зялёных зонаў.

73 Калісьці граф І.Ф. Паскевіч звёз з Варшавы конную статую Юзэфу Панятоўскаму - герою вайны 1812 г. (пляменнік апошняга караля Рэчы Паспалітай, што ваяваў на баку Напалеона). У 1922 годзе палякі вярнулі яго сабе.
Чаму б і гомельцам яго не аднавіць у сваім горадзе? Конных статуй у нас яшчэ няма а гістарычнае права на Панятоўскага мы таксама маем.

74 Кожны вялікі горад мусіць мець заапарк. І хоць меркаванні наконт ягонага будаўніцтва ў горадзе падзяляюцца але ж мы лічым што пры належным падыходзе гомельскім ільвам і зубрам, жырафе і пандзе нічога не будзе пагражаць"

75 Палеанталагічны музей. А чаму б і не? :)